# Ведамасці

Гарадская газета Гродна № 5 26 снежня 2007


*Гродна і гродзенцы – у эфіры “БЕЛСАТА”. Як настроіцца на першы незалежны беларускі тэлеканал, крок па кроку.*

# Глядзі БЕЛСАТ tv BELSAT

**Незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал “БЕЛСАТ” ужо амаль месяц паказвае гарадзенскія падзеі.**

“Бульдозерная рэканструкцыя” Гродна – сюжэт на гэтую тэму быў у эфіры першага дня “БЕЛСАТа”. Стварэнне ў Гродне беларускамоўнай групы дзіцячага садку – у праграме навінаў “Аб’ектыў”. Эканамічная праграма “Кішэня” – паказала апытанне гродзенцаў пра давер да латарэяў ды сюжэт пра гродзенскага фермера. Гродзенцаў паказваюць у праграме “Госць БЕЛСАТа”. Штодзень у эфіры БЕЛСАТа – Гродна и гродзенцы!

Глядзіце БЕЛСАТ на спадарожніках Astra і Sirius

## Што прапануе БЕЛСАТ

**“Аб’ектыў”** – штодзённыя навіны

**“Рэпарцёр”** – падзеі з твайго горада, якіх не паказвае мясцовае тэлебачанне.

**“Кішэня”** – эканамічная аналітыка: што для нашай уласнай кішэні азначаюць эканамічныя рашэнні ўладаў, як стварыць свой бізнес і зберагчы свае грошы.

**“Госць БЕЛСАТа”** – палітыкі, эксперты, грамадскія дзеячы - тыя хто ведае сапраўдную вартасць падзеяў, раскажуць як было і ёсць на самой справе.

**“Запальнічка”** – найноўшыя кліпы беларускай альтэрнатыўнай сцэны, хіт-парад БЕЛСАТа.

**“Невядомая Беларусь”** – дакументальны цыкл. Якой на самой справе была гісторыя нашай краіны? Чаго заўсёды не хапала ў падручніках па гісторыі?

**“Калыханкі”**, **“Жаўтуха”** – навіны ад Сашы і Сірожы.

**“Бульбаны”** – мульцяшная беларуская сям’я.

Фільмы і серыялы ў якасным перакладзе на беларускую мову, і многае іншае

## Як прымаць БЕЛСАТ?

Тэлеканал “БЕЛСАТ” надае праз спадарожнік Astra **(параметры Astra 1 Kr, пазіцыя 19,2° E, палярызацыя H, частата 10773 МГц)**. Эфір – ад 18.00 да 22.00 са штогадзіннымі паўторамі.


Фота http://photo.bymedia.net

**Глядзі БЕЛСАТ на спадарожніку Astra (Astra-19,2° E, палярызацыя H, частата 10773 МГц), а з 1 студзеня і на Sirius**

**ДАВЕДКА:**

БЕЛСАТ – гэта новы канал, які ўваходзіць у структуру TVP. Зарэгістраваны брэнд - БЕЛСАТ / BELSAT TV. Над стварэннем новага беларускага тэлебачання яшчэ з чэрвеня 2006 г. працавала група дасведчаных журналістаў з Польшчы і Беларусі. БЕЛСАТ – гэта тэлебачанне, блізкае нашаму штодзённаму жыццю. БЕЛСАТ ствараюць беларусы для беларусаў на роднай мове.

**А. Калі ў цябе ёсць спадарожнікавая антэна, якая прымае сігнал спадарожніка Astra:**

1. А 18:00 па беларускім часе ўключы тэлевізар і пашукай назву БЕЛСАТ TV у спісе каналаў.

2. Калі не знойдзеш адразу, уключы аперацыю SCAN.

3. Дадай БЕЛСАТ TV да ўлюбёных, каб першы незалежны канал для Беларусі заўсёды быў пад рукой!

**Б. Калі ў цябе ёсць спадарожнікавая антэна, аднак яна скіраваная на іншы спадарожнік.**

Перастаўляючыся на Astra, ты не мусіш адмаўляцца ад прыёму іншага спадарожніка. Дастаткова паставіць яшчэ адну галоўку (канвертар). Дзякуючы дадатковым канвертарам ты можаш прымаць сігнал нават з некалькіх спадарожнікаў.

**В. Уцябе няма абсталявання, а ты б хацеў глядзець БЕЛСАТ.**

1.Ад студзеня 2008 году БЕЛСАТ TV будзе транслявацца таксама па спадарожніку Sirius. Ужо сёння можна набыць антэну і скіраваць яе на Sirius. Памятай, што замацоўваць антэну трэба на паўдзённым баку будынку.

3.Для якаснага прыёму праўдзі кабель ад антэны да прыёмніка найкарацейшым шляхам, пастарайся, каб ніякія перашкоды (напрыклад, дрэвы) не засланялі антэны.

**«Ведамасці»**

# Змены на мяжы

**Увозіць гарэлкі ў Беларусь цяпер можна болей, а асабістых рэчаў – меней. З 22 снежня змяніліся нормы бяспошліннага ўвозу тавараў для асабістага карыстання.**

Цяпер дазваляецца ўвозіць да двух літраў алкагольных напояў (напой лічыцца алкагольным, калі масавая доля этылавага спірту ў ім складае 7% і больш). Піва ў гэтыя два літры не ўваходзіць, але толькі пры ўмове, калі доля этылавага спірту ў ім складае менш за 7%. Раней норма ўвозу алкаголю ў Беларусь складала адзін літр.

Фізічная асоба цяпер мае права бяспошлінна ўвозіць на тэрыторыю Беларусі 35 кг тавараў для асабістага карыстанне (раней можна было 50 кг). У межах гэтай нормы можна ўвозіць таксама пыласосы ды мэблю.

Крыху спакою могуць мець цяпер тыя, хто накіроўваецца на адпачынак. З пераліку тавараў, якія абкладаюцца мытнымі пошлінамі пры ўвозе, выключаная відэаапаратура.

Адмененыя колькасныя абмежаванні на ўвоз прадметаў вопраткі з натуральнай скуры і футра. Бяспошлінна можна ўвозіць і ювелірныя вырабы ў колькасці да 5 адзінак.

Паводле ўказа “Аб ільготным перамяшчэнні праз мытную мяжу тавараў для асабістага карыстання”, таксама ўсталёўваюцца абмежаванні па ўвозе аўтамабіляў для асобаў, якія не з’яўляюцца ўласнікамі транспартнага сродку і не рэгіструюць гэты від прадпрымальніцкай дзейнасці. Увоз такімі асобамі аўтамабіляў два і больш разоў на працягу каляндарнага году будзе разглядацца як прадпрымальніцкая дзейнасць. Стаўкі “растаможкі” для ўжываных аўтамабіляў захоўваюцца на ранейшым узроўні.

**Віктар Казак**

**Смех**

# Гродзенцаў не абдурыш

Большасць апытаных газетай «Вечерний Гродно» упэўненыя, што падрыхтаваны Міністэрствам унутраных спраў Беларусі (МУС) спіс «невыязных» беларусаў рабіўся, каб не выпускаць за мяжу апазіцыянераў.

Пытанне тыдня ў адным з апошніх нумароў газеты гучала наступным чынам: «Каго ў новым годзе не выпусцяць за мяжу пасля адмены штампу?». 13 снежня на інтэрнэт-старонцы выдання сімпатыі апытаных размеркаваліся наступным чынам:

Апазіцыянераў — 25 (39.1%)

Аліментшчыкаў — 14 (21.9%)

Чыноўнікаў — 11 (17.2%)

Рэцыдывістаў і злодзеяў у законе — 8 (12.5%)

Неплацельшчыкаў крэдытаў — 5 (7.8%)

Парушальнікаў правілаў дарожнага руху — 1 (1.6%)

У той самы дзень апытанне на сайце было зьененае.

Нагадаем, што кіраўнік МУС Уладзімер Навумаў паведаміў, што больш за 100 тысяч чалавек увойдуць у “спісы невыязных” пасля адмены штампу “Ва ўсе краіны свету”.

**Заўважыла НН**




## “Новабеларускія” імёны

Даслалі чытачы “Ведамасцяў”:

Перепил - Переговоры Путина и Лукашенко

Зараза - За развитие агрогородков

Набибна - Национальная библиотека - наш алмаз

Ольгуда - Отобрать льготы у дармоедов

# Граница на Шенгене

**Генеральное консульство Польши в Гродно сообщило об изменениях в выдаче виз.**

Шенгенская виза для белорусов стоит 60 евро, независимо от типа и количества поездок, - об этом сообщил на пресс-конференции новый генеральный консул Польши в Гродно Адам Бернатович.

Анкеты на получение этих виз Генеральное консульство Польши в Гродно начало принимать уже 21 декабря. Для выдачи Шенгенской визы требуются дополнительные документы: например, для туристической надо будет предоставить подтверждение бронирования гостиницы или выкупленную путевку; для бизнес-визы (например, водителям TIR и работникам польских фирм) - два приглашения, из Польши и другой страны Шенгенского договора.

Уже выданные национальные польские визы будут действовать до срока их истечения.

Кроме, того, национальные польские визы будут выдаваться и наряду с Шенгенскими. Однако и тут требования к соискателям будут намного более серьёзными, чем до сих пор. Во-первых, стоимость визы, независимо от типа и срока – 35 евро. Во-вторых, запрос на визу должен будет подтверждаться оригиналами документов, выданных польскими госорганами: приглашение, разрешение на работу, подтверждение уплаты налогов. Нельзя будет съездить в другую страну по польской национальной визе – допустимым является только транзит через Кипр, Мальту, Чехию Словакию, Венгрию, Латвию.

Процедура оформления будет занимать минимум 5 дней, предупредил Адам Бернатович: ***«Поэтому я советую всем, кто планирует выезжать в Польшу, заняться оформлением документов не менее за месяц до поездки»***, - сказал генеральный консул. Выдача экспресс-виз предусмотрена только в самых крайних случаях (болезни и смерти близкого родственника, причем подтвержденных документально).

Любое правонарушение, допущенное на территории европейских государств, благодаря общей информационной системе, мгновенно станет известно в консульстве и может повлиять на решение о выдаче визы.

***«Наверняка не получит визы тот, кто пересекает границу каждые 2 дня по туристической визе»,*** - прокомментировал Адам Бернатович.

Об объеме нелегальной приграничной торговли, по словам дипломата, свидетельствует такая цифра: примерно 2/3 тех, кто в этом году обращался за визами в генеральное консульство Польши – в анкете указывали, что они безработные.

**Наталья Свороб**

# Горад з-пад малатка

**Два помнікі архітэктуры старога цэнтра Гродна прададзеныя з аўкцыёна. Не выключана, што новыя гаспадары разбураць будынкі.**

Архітэктурны помнік 2-й катэгорыі, будынак стылю мадэрн па вул. Сацыялістычнай,44 быў прададзены за 675 мільёнаў рублёў. У выніку аўкцыёну кошт будынку змяніўся даволі значна: пачатковая цана была на 210 мільёнаў меншай. За будынак па вул. Сацыялістычнай змагаліся два прэтэндэнты, калі ў наяўнасці толькі адзін ахвотны, аб'ект адразу здымаюць з аўкцыёну. У гэтым двухпавярховіку яшчэ нядаўна было аддзяленне "Беларусбанку".

Камяніца па вул. Урыцкага, 21, пабудаваная ў 1885 годзе – таксама ўваходзіць у пералік архітэктурных помнікаў. Пачатковы кошт, выстаўлены гарвыканкамам быў 72 мільёны рублёў будынак у выніку прададзены за 90 мільёнаў рублёў. Адзіная ўмова для новага гаспадара - рассяліць цяперашніх жыхароў.

Гарадзенскія гісторыкі ды краязнаўцы неаднаразова выказвалі перасцярогу, што будынкі ў выніку іх продажу могуць быць знесеныя, таму што перад новымі ўладальнікамі не ставіцца ўмова іх абавязковага захавання.

***"Мы не ведаем нічога пра новых гаспадароў будынкаў – ні хто яны, ні якія іх планы, ні якія сродкі яны маюць намер укладаць у рэканструкцыю будынкаў. Ад грамадскасці хаваюць гэтую інфармацыю, спасылаючыся на камерцыйную таямніцу. Адзінае, што абвешчана, што новыя інвестары - расіяне",*** - каментуе краязнаўца Ігар Лапеха.



Фота «Наша Ніва»

Вул. Сацыялістычная, 44



Фота http://harodnia.com

Вул. Урыцкага, 21. Гэтыя два будынкі прададзеныя

Нагадаем, што абедзве гэтыя камяніцы і яшчэ каля 70 будынкаў старога цэнтра Гродна былі сёлетняй вясной прызначаныя да зносу. Ініцыятарам гэтага стаў гарвыканкам, а рашэнне прыняла навукова-метадычная рада Міністэрства культуры. Гэтым планам перашкодзіў толькі актыўны пратэст жыхароў Гродна: кампанія "Выратуем Гродна" - пікеты, флэшмобы, заявы ў пракуратуру, збор подпісаў, абвяшчэнне гарадскога рэферэндуму па захаванню гістарычнай спадчыны.

**Ул.Інф.**

# Даеш беларускі садок!

**Рэклама беларускамоўных садкоў ізноў з'явіцца ў гродзенскім транспарце, калі тэкст абвесткі будзе ўзгоднены з гарвыканкамам.**

Такую ўмову паставіў кіраўнік гарадскога аддзела адукацыі Сяргей Блажэй бацькоўскаму камітэту, які дамагаецца стварэння ў Гродне беларускамоўнага садка.

Нагадаем, паведамленне пра стварэнне беларускамоўнага садка гучала ў гарадзенскім транспарце ўсяго тры дні. Пасля тралейбуснае ўпраўленне зняло ролік па загадзе гарадскога аддзела адукацыі.

Камітэт аб'яднаў маладых бацькоў 12 дзетак. Падчас сустрэчы з бацькамі Сяргей Блажэй прапанаваў камітэту заняцца арганізацыяй дзвюх беларускамоўных груп, яснельнай і малодшай, у гродзенскіх дзіцячых садках.

Ігар Кузьмініч паведаміў "Ведамасцям", што нават маючы дазвол гарвыканкама, камітэт будзе вымушаны самастойна плаціць тралейбуснаму ўпраўленню за размяшчэнне абвесткі. Сяргей Блажэй адмовіўся паспрыяць у размяшчэнні абвестак і на мясцовым радыё ды тэлебачанні: "Ён сказаў, што радыё і тэлебачанне – гэта структуры абласныя, а значыць па дапамогу трэба звяртацца ў аблвыканкам", - сказаў Ігар Кузьмініч.

***"Але вынікі сустрэчы я лічу станоўчымі. Дзве групы – гэта ўжо сістэма, дзякуючы якой можна стварыць пераемнасць,*** - пракаментаваў адзін з бацькоў, юрыст Ігар Кузьмініч. – ***Дзеці, якія пачнуць хадзіць у гэтыя групы – закладуць аснову для стварэння беларускамоўнага першага класа".***

Пакуль няясна, якія арганізацыйны ўдзел, акрамя ўзгаднення тэксту аб'яўкі, гатовы ўзяць на сябе гарвыканкам. Яшчэ ўлетку чыноўнікі ад адукацыі паведамілі камітэту, што ў гарвыканкама для стварэння беларускамоўнага садка няма ні памяшкання, ні кадраў, ні грошай.

**Раман Суліма**





Наша група - гэта чулая атмасфера, шчырыя выхавацелькі і развіццё здольнасцей дзіцяці на аснове беларускай мовы і культуры.
Нас ужо дванаццаць!
Калі ласка, далучайцеся да нас!
Тэлефануйце
Кузьмінічу Ігару Расціслававічу
Velcom: 629 92 13 МТС: 868 98 82


# Зніклі бангладэшцы

**Дзевяць грамадзянаў Бангладэш зніклі ў Гродна. Усе яны з'яўляюцца студэнтамі падрыхтоўчага аддзялення Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы.**

Першая заява аб знікненні двух студэнтаў паступіла з дэканата падрыхтоўчага аддзялення універсітэта ў аддзяленне міліцыі 12 снежня. На наступны дзень дэканат паведаміў пра знікненне яшчэ сямі студэнтаў. Высветлілася, што студэнты-замежнікі ўзялі з сабой усе свае дакументы і з'ехалі ў невядомым накірунку. На два з іх пашпартоў былі купленыя квіткі ў Расію.

***"Верагодней за ўсё студэнты з Бангладэш і не збіраліся вучыцца ва ўніверсітэце, яны выкарысталі паступленне, як магчымасць нелегальнай міграцыі ў Еўропу",*** - мяркуюць у Міністэрстве ўнутраных спраў (МУС).

**Ул. інф.**

# Кантроль мацнее

**Дружыннікі будуць кантраляваць аплату праезда ў гродзенскіх аўтобусах. Аўтапарк №1 ад панядзелка вывеў на маршруты 30 "добраахвотных кантралёраў" з ліку сваіх супрацоўнікаў.**

Брыгада дружыннікаў створана ў сувязі з адменай ільготаў па аплаце праезда, паведаміў "Ведамасцям" дырэктар гродзенскага АП №1 Мікалай Дрэвіла. Яны будуць выходзіць на кантроль пасажыраў пасля рабочага дня.

У першую чаргу дружыннікі будуць звяртаць увагу на нядаўніх ільготнікаў – пенсіянераў, студэнтаў, таксама і міліцыянтаў: ***"Калі злапаем безбілетнага міліцыянта – паведамім яму на працу",*** - гаворыць Дрэвіла.

# Праваслаўныя без газеты

**Абласное аддзяленне "Белпошты" выключыла газету "Гродненские епархиальные ведомости" з падпіснога каталогу на наступны год.**

Набываць газету магчыма будзе толькі ў храмах і кніжным шапіку Епархіяльнага ўпраўлення.

Фармальнай падставай для адмовы ўключыць выданне Гродзенскага епархіяльнага ўпраўлення Беларускай праваслаўнай царквы ў каталог стала тое, што рэдакцыя несвоечасова прадаставіла заяўку УП "Белпошта". Галоўны рэдактар "Гарадзенскіх епархіяльных ведамасцяў" Аляксандр Шурскі лічыць, што гэта толькі прыдзірка паштовага ведамства.

**Яніна Раманчук**

*“Ведамасці” паглядзелі, як беларусы вызваляюцца ад энергетычнай залежнасці ад Расіі*

# Дровы forever!

**Невялічкі будынак кацельні ў мястэчку Лунна, што на Мастоўшчыне, здалёк нябачны за штабелямі і гарамі бярвення. Праца чатырох “аператараў кацельні” – кругласутачная: загрузіць дровы ў жалезную тачку, завезці да катла, парубаць сякерай і запхаць у топку.**

***“Не. Да нармальнай тэмпературы мы на дровах не награваем!*** - распавядае адзін з качагараў. – ***Па нарматыву мы павінны даць на выхадзе 60 градусаў, а даем каля 40-45. У мэтах эканоміі мы на ноч паліць перастаем, пачынаем толькі а 4-й раніцы, каб нагрэць дзіцячы садок да прыходу дзяцей”.***

Да гэтай кацельні ў Лунне падключаны жылы дом, школа і дзіцячы садок:

***“Зранку я запальваю духоўку, каб было цёпла, калі дзеці прачнуцца,*** - расказвае маладая маці Валянціна. – ***У дзіцячы садок апранаю на іх па два швэдры”.***

Лунненская кацельня - адна з 2 тысячаў, пераведзеных у Беларусі з газу на дровы. У бліжэйшыя два гады так павінны паліцца ўсе энергааб’екты на беларускай вёсцы і ў малых гарадах. Гэта - асноўны спосаб зніжэння энергетычнай залежнасці Беларусі ад расійскага газа. Так прадугледжана Дзяржаўнай праграмай выкарыстання мясцовых відаў паліва.

## Ход бервяном

Цяпер доля імпартаванага з Расіі газа ды нафты ў энергаспажыванні Беларусі складае 80%. Згодна Дзяржпраграме, у 2010 годзе доля драўніны павінна вырасці амаль у чатыры разы: з сённяшніх 4% - да 15%.

Такім чынам, у 2010 годзе драўніна дазволіць зэканоміць валюту, якая бы пайшла на імпарт 4 мільёнаў тон умоўнага паліва.

Праўду кажучы, гэты “прарыў” забяспечыць толькі малая энергетыка – кацельні сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ЖКГ), мясцовых прадпрыемстваў. У 2010 годзе буйныя электра- і цеплацэнтралі будуць прадукаваць толькі 2% энергіі з мясцовых відаў паліва. Па словах кіраўніка ўпраўлення ДзВА “Белэнерга” Антона Шчэрбіча, гэта звязана з нізкай энергааддачай такога віда паліва.

## Выгада

***“Пры сённяшніх коштах на газ, кілават ці гігакалорыя цяпла выходзіць таннейшай калі паліць драўнінай,*** - тлумачыць “Ведамасцям” Уладзімер Вайцеховіч, намеснік дырэктара РУП “Белінвест энергазберажэнне”. - ***Але гэта пры ўмове, што нарыхтоўкай дроваў займаюцца прафесійныя арганізацыі”.***


Фота http://photo.bymedia.net

**Калі так нарыхтоўваць дровы, то ацяпленне - удвая даражэй, чым на газе**

**ДАВЕДКА:**

Энергаспажыванне Беларусі 2007 год: Імпарт – газ 57, 9%, нафта 19,8%, вугаль – 1%, электраэнергія – 5,3%. Уласныя рэсурсы – нафта, торф, гідра-і ветраэнергетыка – 11%, драўніна – 4%

План энергаспажывання 2010 год: Імпарт – газ 47,7%, нафта 23%, вугаль 2,7%, электраэнергія 2,6%. Уласныя рэсурсы – нафта, торф, гідра і ветраэнергетыка 11%, драўніна – 15%

Праўда ў выпадку кацельні ў Лунне такі разлік не працуе:

***“Мы за суткі спальваем 2 машыны дроваў, гэта прыкладна 200 даляраў, а раней газа мы спальвалі 900 кубоў, гэта па сённяшніх коштах каля 100 даляраў”,*** - распавядаюць качагары.

Беларускія чыноўнікі спасылаюцца на Швецыю, Фінляндыю, Нарвегію, чые энергасістэмы на 25-30% працуюць менавіта на драўніне. Аднак Беларусі трэба амаль з нуля ствараць эфектыўную інфраструктуру. Трэба пабудаваць 14 тыс. км лясных дарог для вывазу бярвення. Наладзіць вытворчасць спецыяльных грузавікоў – бо не выгадна вазіць дровы далей за 30 км машынай меньшай за 40 куб. м. Патрэбныя апараты для расшчаплення бярвення ў трэску. Патрэбныя высокаэфектыўныя катлы па яе спальванню.

Дзяржпраграма прадугледжвае на гэтыя мэты 750 мільёнаў даляраў. Але пакуль усе новыя (імпартныя) тэхналогіі былі ўжытыя толькі на пяці дэманстрацыйных аб’ектах вялікай энергетыкі.

***“І стварэнне гэтых аб’ектаў у пераліку на кошт 1 кілаватт атрымоўваюцца даражэйшымі за традыцыйныя, газавыя,*** - гаворыць Антон Шчэрбіч. – ***І даражэйшыя істотна, разы ў паўтары”.***

Сельскія ж кацельні пераводзяцца на драўніну самым танным спосабам, адміністратыўным: 90% з іх - выкарыстоўваюць ручную працу. Страты ад такога спосабу гаспадарання на кладуцца на ўладальнікаў кацельняў – ЖКГ, прадпрыемствы ды гаспадаркі.

***“Ну, нас яны не надта забяспечваюць абсталяваннем,*** – распавядае качагар кацельні ў Лунне. – ***Вось тачку гэтую я з хаты бяру, добра, што жыву непадалёк. Лом, піла, сякера – усё маё. Камера спальвання ў пячы – метр восемдзесят, а бярвенні нам прывозяць – два метры. Так што прыйдзецца пілаваць ды рубаць, як у мінулым годзе... А што халадно – то не ўсё ад качагара залежыць!”***

**“Ведамасці”**

# Купляем меней – плацім болей

**Беларусы купляюць меней тавараў, але трацяць на іх болей грошай – гэта высновы беларускага Мінстату па выніках працы эканомікі ад пачатку года.**

Сёлета сярэдняя беларуская сям’я патраціла на харчаванне, вопратку ды камуналку на 20 % болей, чым у мінулым годзе. Асабліва моцна ад пачатку года выраслі выдаткі беларусаў на харчовыя прадукты - у сярэднім прыкладна на 55 тысяч рублёў на чалавека ў месяц. Пры гэтым фізічны аб’ём прадуктаў харчавання, што купілі беларусы – скараціўся на 8%.

Асноўны складнік росту выдаткаў на харчаванне – павелічэнне коштаў. Мясныя і малочныя прадукты даражэлі чатыры разы – у студзені, сакавіку, кастрычніку ды лістападзе, калі дзяржава паднімала закупачныя кошты на малако. Кожны раз на 5 %. Апошні раз падвышэнне Мінэканомікі тлумачыла “неабходнасцю скарачэння ўзніклага разрыву ў коштах на мясамалочную прадукцыю ў Беларусі і Расіі, спынення яе некантраляванага вывазу”.

У наступным годзе рост коштаў на харчаванне прагназуецца на ўзроўні 80-200%. Акрамя таго, у Беларусі падаражэюць будаўнічыя матэрыялы, сантэхніка, бытавая тэхніка – з-за росту мытных ставак на іх увоз.

Па афіцыйных дадзеных інфляцыя ў краіне ў 2007 годзе вырасла ўдвая ад плану: яна складзе каля 13%, хаця прагнозам прадугледжвалася не болей за 8%. Рэальная інфляцыя, па меркаванню былога старшыні Нацыянальнага банка Беларусі Станіслава Багданкевіча, нашмат вышэйшая:

***“Для падліку ўзроўню інфляцыі Нацбанк выкарыстоўвае групу тавараў, кошты на каторыя ў асноўным рэгулююцца дзяржавай, напрыклад, малако, хлеб. У той жа час, не ўлічваюцца рост коштаў на жытло, на яго арэнду – а ў гэтых сектарах рост быў у некалькі разоў большым”.***

# “Богатые” едят на 14 тысяч в день

**Более 38% населения (ок 410 тыс. человек) Гродненщины имеют среднедушевой доход менее 300 тысяч рублей в месяц на человека. Таковы официальные данные белорусского Минстата.**

При этом семей с детьми, где средний доход на человека составляет меньше бюджета прожиточного минимума – 12% от всего количества домашних хозяйств, это на Гродненщине около 50 тысяч семей.

Так называемых «богатых», жителей со среднедушевым доходом более 500 тысяч рублей, в Гродненской области около 19% населения (ок 200 тыс. человек).

Исследования показали, что неравенство в доходах проявляется неравенством в потреблении:

«Богатые» семьи тратят в среднем 423 тысячи в месяц на питание, это 14 тысяч рублей в день. А бедные – 183 тысячи, это 6 тысяч рублей в день на всех членов семьи.

Независимо от материального и финансового положения употребление картофеля в год составляет на каждого жителя Беларуси около 70-76 кг. Причем, наименее обеспеченные съедают по 73 кг. Наиболее обеспеченные – по 70 кг. Второй товар – хлеб. Его границы потребления у «богатых» – 89 кг. У самых бедных – 94 кг. Табачные изделия потребляет в месяц каждый «богатый» на сумму 11,9 тысяч рублей. А бедные –на 9,3 тысячи.

Разница в питании проходит по таким продуктам, как мясо и молоко. В бедных семьях молока выпивают в 2 раза меньше, чем в богатых. Мясо у «богатых» в 3 раза чаще попадает на обеденный стол.

Средняя «богатая» семья покупает в месяц непродовольственных товаров (обувь, одежда, средства гигиены, книги, телевизоры, автомобили) на 485 тысяч рублей. Самые бедные, живущие ниже бюджета прожиточного минимума – на 88,9 тысяч рублей.

**Наталля Свораб**



# Аляксандр Мілінкевіч: «Бярыцеся да работы!»

**Беларусь адстае ад працэсаў, якія ідуць у Еўропе. На жаль, гэтая выснова ўжо даўно перастала быць проста эмацыйным уражаннем. Праблема цывілізацыйнага адставання нашай краіны становіцца відавочнай. Малдова, Грузія, Украіна актыўна рэалізоўваюць праграмы супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам, а мы, Беларусь, як, быццам бы, шэрая пляма.**


Фота «Ведамасці»

Віна ў тым, што Беларусь сёння на задворках Еўропы, ляжыць на беларускім кіраўніцтве. Усё, што можам рабіць мы, грамадзяне краіны, мы робім. Але ёсць канкрэтныя крокі, якія павінна зрабіць улада, таму што ад гэтага залежыць эканамічнае супрацоўніцтва Еўропы і Беларусі, падтрымка рэформ, развіццё нашай краіны. Мы можам рэкамендаваць, аналізаваць, падказваць, наводзіць масты, але праводзіць у жыццё павінен той, хто трымае ўладу ў сваіх руках.

Вызваленне ўсіх палітвязняў і спыненне рэпрэсій супраць грамадзянаў краіны - гэта першы крок, які абавязаны зрабіць афіцыйны Мінск.

Беларускай уладзе не хапае адчування рэальнасці. Нельга паўтараць партнёрам у Еўропе з года ў год - "давайце толькі гандляваць, але не пытайце ў нас пра дэмакратыю, пра выбары, пра правы чалавека, пра свабоду слова". Так не атрымаецца. Спосаб вядзення перамоваў з Еўропай, якім карыстаецца беларускія ўлады - учорашні дзень, сёння ніхто на падобныя заявы не рэагуе.

Істотная рэч палягае ў тым, што беларускаму кіраўніцтву прапаноўваюць вельмі выгаднае супрацоўніцтва з адной толькі ўмовай - пачніце дэмакратызаваць краіну. І гэта не ёсць прэтэнзіі канкрэтна да Аляксандра Лукашэнкі. Усе, хто хоча супрацоўнічаць з Еўрапейскім Саюзам, усе хто абірае эканамічнае развіццё і шлях сваіх краін у Еўропу, следуюць такім шляхам.

Ніхто не патрабуе ад уладаў, каб дэмакратызацыя адбылася за адзін дзень. Усе выдатна разумеюць, што не можа за адзін дзень змяніцца кіраўніцтва дзяржавы, якое 12 год кіруе Беларуссю з дапамогай дэкрэтаў, заціскання гаек, закрыцця газет, спецслужбаў і спецназу, разгону дэманстрацый апазіцыі, асуджэннямі палітыкаў і моладзі. Гэта - працэс, і ў аснове гэтага працэсу павінна ляжаць жаданне дабрабыту Беларусі і беларускаму народу. Еўрапейскі бок гэтае жаданне дэманструе. Чарга за беларускім кіраўніцтвам.

Палітыка сёння сапраўды максімальна прагматычная, прызнаюца толькі канкрэтныя дзеянні.

Ніхто не будзе супрацоўнічаць з той краінай, дзе людзі сядзяць у турмах за палітыку, за графіці, за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Еўропа ўжо навучылася дзейнічаць паводле прынцыпаў маральнай палітыкі. Перакананы, што шмат людзей уздыхнулі б з палёгкай і ў нашай краіне і ў дэмакратычных краінах Еўропы, калі палітычныя вязні былі б вызваленыя.

У сваю чаргу мы, прадстаўнікі дэмакратычных сіл гатовыя і будзем адстойваць інтарэсы Беларусі, даказваць урадам краін Еўропы і ЗША неабходнасць спрыяння інвестыцыям у беларускую эканоміку, пераконваць аб прадстаўленні крэдыту беларускаму ўраду з мэтай рынкавага рэфармавання беларускай эканомікі і змякчэння наступстваў росту коштаў на энерганосьбіты, паступова скасоўваць санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў і дзяржаўных прадпрыемстваў.

**Аляксандр Мілінкевіч, кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь на выбарах 2006, лідэр Руху "За Свабоду"**

***Дарагія суайчыннікі.***

***Ужо традыцыйна на працягу шматлікіх стагоддзяў мы перажываем самую таямнічую і светлую падзею ў жыцці хрысціянскага свету - Нараджэнне Езуса Хрыста. Із гэтай нагоды Свята Божага нараджэння жадаю Вам і Вашым родным сямейнай цяплыні і любові, добрага здароўя і ўпэўненасці ў будучым. Няхай святло Віфлеемскай зоркі асвячае ўсе Вашы жыццёвыя памкненні.***

***А яшчэ ўсім нам перамогі ў нашай агульнай справе – вяртання ў Беларусь свабоды, праўды і справядлівасці.***

***Вясёлых і радасных святаў!***

**Аляксандр Мілінкевіч**

# Вярхоўны суд не хоча Руха "За Свабоду"

**У Вярхоўным судзе адбыліся слуханні па скарзе аргкамітэта ПАГА "Рух "За Свабоду". Рашэнне Мінюста аб нерэгістрацыі аб'яднання пакінута без зменаў.**

Суддзя Ганна Сакалоўская прыняла рашэнне пакінуць скаргу заснавальнікаў ПАГА "Рух "За Свабоду" без задавальнення. Суддзя заявіла, што не было заяўкі і дазволу на масавае мерапрыемства, падчас якога адбыўся ўстаноўчы сход. Такім чынам Вярхоўны суд цалкам прыняў бок прадстаўніка Міністэрства юстыцыі Аляксея Печкурова.

Лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч, ты не менш, адчувае за сабой маральную перамогу.

***"Мы не сумняваліся, што незалежную арганізацыю зноў не зарэгіструюць, але мы імкнемся дзейнічаць легальна, у межах Закону і выкарыстоўваем усе патэнцыйныя магчымасці дзеля гэтага. Нашыя грамадскія прадстаўнікі прадэманстравалі ўсю абсурднасць абвінавачванняў Мінюсту. Рашэнне суду ніякага дачынення да заканадаўства не мае і цалкам заснавана на палітычнай мэтазгоднасці. Мяркую, гэта разумелі і суддзя, і прадстаўнік Мінюсту, і пракурор. Ім напэўна было сорамна. Таму мы адчуваем за сабой маральную перамогу",*** – каментуе вынікі судовага паседжання Аляксандр Мілінкевіч.



Фота www.milinkevich.org

**Улады не хочуць юрыдычна прызнаваць Рух "За свабоду"**

Аляксандр Мілінкевіч таксама паведаміў, што дзяржава ўжо шмат гадоў мэтанакіравана ліквідуе грамадзянскую супольнасць у краіне. Аднак Рух будзе і надалей ажыццяўляць

## "ВЕДАМАСЦІ" ў інтэрнеце

**на www.kamunikat.org**

Усе папярэднія і ўсе новыя нумары гарадзенскай незалежнай газеты **"ВЕДАМАСЦІ"** можна прачытаць, раздрукаваць і перадаць іншым на

**www.kamunikat.org/viedamasci.html**

На KAMUNIKAT.org адбылася сапраўдная рэвалюцыя! Яе вынік – гэта прафесійны сайт з каталогам, пошукавай сістэмай, падпіскай RSS, топ-спісам выданняў і шмат чым яшчэ.

Сайт KAMUNIKAT.org сабраў больш за 500 беларускіх кніг і часопісаў. У пачатку 2008 году будзе іх больш за 1000!

**Добрая справа**

# Куда ДЕТься нашИм детям

**Мы, когда говорим о нашей жизни, о ее смысле, всегда, согласитесь, говорим о детях, о своих детях; о детях, которых мы видим на улице, в транспорте, возле школ. Не всегда они участливы к нам, зачастую безразличны. Мы обсуждаем их, часто нарекаем, иногда осуждаем, но не всегда задумываемся, почему они такие.**

Не хочу, чтобы наш разговор походил на рассуждение «есть ли жизнь на Марсе», поэтому возьмем микрорайон «Вишневец», где я живу. Район изменился, и многие скажут, здорово, смотри, дорожки заасфальтировали, сделали карманы для автомобилей, детские площадки в некоторых дворах. Но все ли так здОрово, или здоровО, как кажется на первый взгляд?

Многие детские площадки урезали для парковки автомобилей. А площадки, которые организовали для детей, я бы назвал скорее - место «для выгула детей». Примитивные горки, качалки, песочницы, огороженные заборчиком. У нас в районе одна треть жителей - дети, и большинство из них - среднего и старшего возраста. Если мы увидим ребенка десяти лет и старше на качалке и качелях, мы будем возмущаться, при этом незадумываясь, а куда им себя деть. Мы возмущаемся, что они постоянно ютятся в подъездах или при входе в них. Мы негодуем, что старшие дети пьют пиво в подъездах.


Фота «Ведамасці»

**Сергей Кузьменок**

А что сделали представители власти, чтобы этого не было. Одни призывы вступать в БРСМ. Но могут ли изменить имеющуюся проблему скидки на билеты на дискотеку, компьютерные клубы в маленьких комнатах, зазывы посещать ледовый дворец, где приходиться выставать детям по выходным дням долгое время в очереди, чтобы попасть на лед?

Почему в большом микрорайоне не продумывается строительство культурно - бытового-оздоровительного центра на месте существующей стоянки? Почему во дворе не возможно предусмотреть небольшую площадку со щитом и кольцом для дворового баскетбола. У нас имеются свободные площади возле островка леса, где можно построить площадку для скейтборда и езды на роликовых коньках. Почему не обустроить в небольшом леске полосу здоровья; здание, которое предполагалось под станцию переливания крови перепрофилировать для занятий по скалолазанию или для занятий паркуром?

Вопросов, как видите, большое количество. Не меньше и предложений. Но чаще всего они «зависают в воздухе». Власть чаще всего оставляет их без должного внимания, забот у нее много. А мы, прячась за свою усталость, занятость на работе, нехватку времени, соглашаемся с этим, говоря себе «а что мы можем?!».

**Сергей Кузьменок, депутат Гродненского городского совета депутатов (2003-2007)**

**Ад рэдакцыі:**

Сяргей Кузьмянок з'яўляецца ініцыятарам стварэння ў мікрараёне «Вішнявец» тэрытарыяльнага грамадскага камітэта самакіравання. Іх роля ў тым, каб не за нас вырашалі, а мы самі прымалі рашэнні, а пасля кантралявалі іх выкананне, планавалі нашае жыццё, жыццё нашых дзяцей.

Калі ў Вас узнікаюць пытанні, ідэі, прапановы як зрабіць нашае жыццё больш утульным, заклікаем Вас звяртацца да яго па тэлефонам 54-92-31, (+375 29 786 32 71).

Выдаецца па ініцыятыве Гарадзенскага Руху «За Свабоду» Адрас рэдакцыі: г. Гродна, пл Тызенгаўза,1. Галоўны рэдактар Антоні Тызенгаўз Падпісана ў друк 25.12.2007.
Наклад адпаведна заканадаўству. Надрукавана на ўласным абсталяванні рэдактара. Замовіць падпіску на электронную ці папяровую версію газеты «Ведамасці» можна на адрасе: zasvabodu.hrodna@gmail.com